■ З нагоды

# РОДНЫМ СТОЎБЦАМ

## Райцэнтр адзначыў 425-годдзе





ПАВОДЛЕ рашэння раённага Савета дэпутатаў днём нараджэння горада было прынята лічыць 20 чэрвеня 1593 года. Дакладную дату заснавання прапанавалі навукоўцы. У кастрычніку 2016-га ў Стоўбцах прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Стаўбцоўшчына — гісторыка-культурная спадчына Наднёманскага рэгіёна», якую арганізавалі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук і райвыканкам. Захапляльны гістарычны экскурс у мінулае зрабіў дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук Андрэй Латушкін. На аснове вывучаных матэрыялаў фонду Слушак, што захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, ён параіў устанавіць новую дату заснавання Стоўбцаў. Агульнапрыняты да гэтага год першага ўпамінання горада — 1511-ы — аспрэчваўся гісторыкамі. Прапанова ўвайшла ў рэзалюцыю канферэнцыі.

— У канцы XVI стагоддзя Стоўбцы называліся інакш, — канстатаваў Андрэй Латушкін. — У прывілеі польскага караля Жыгімонта III, які быў дадзены ўдаве крычаўскага старасты 20 чэрвеня 1593 года на правядзенне таргоў і кірмашоў, населены пункт узгадваецца як новапасаджанае месца (заснаванае нядаўна), «мястэчка Свержаньскае над Нёмнам, у павеце Мінскім ляжачае». Аднак гэтая назва праіснавала нядоўга. Справа ў тым, што на супрацьлеглым беразе ракі Нёман ужо размяшчалася мястэчка Свержна, якое належала князям Радзівілам (сёння вёска Новы Свержань). Каб пазбегнуць блытаніны ў дакументаабароце, Слушкі перайменавалі заснаванае імі ў сваіх уладаннях мястэчка. У прыватнасці, у адной з судовых спраў паміж Слушкамі і Радзівіламі, датаванай 1632 годам, тое ж самае мястэчка, размешчанае на правым беразе Нёмана, ужо згадваецца як Стоўбцы (у арыгінале — Столпцы). Таму, на думку гісторыка, цалкам справядліва, што часам заснавання райцэнтра выступае дата 20 чэрвеня 1593 года.



Да юбілею горада ў Стоўбцах пачалі рыхтавацца загадзя. Добраўпарадкавалі двары і вуліцы, высадзілі шмат кветак і дэкаратыўных кустоў, адрамантавалі фасады дамоў. Стаўбцоўшчына — малая радзіма Якуба Коласа, таму на тарцах чатырох дзевяціпавярховікаў на вуліцы Цэнтральнай з'явіліся тэматычныя кампазіцыі. У перспектыве будзе ўстаноўлены помнік Песняру.

А непасрэдна ў дзень святкавання, 23 чэрвеня, для гараджан і шматлікіх гасцей працавалі фотавыстаўкі і літаратурныя гасцёўні, дзе наведвальнікам прапаноўвалі ўспомніць багатую літаратурную спадчыну Песняра.

З самай раніцы вуліцы горада літаральна віравалі цікавымі, змястоўнымі мерапрыемствамі. Шмат людзей прыйшло на выстаўку спецыялізаванай тэхнікі на вуліцу Ленінскую. Побач у «Горадзе майстроў» умельцы праводзілі для ўсіх ахвотных майстар-класы па народным традыцыйным мастацтве. На падворках гаспадарак «Наша хата гасцямі багата» дэманстравалася мноства відаў сельгаспрадукцыі. «Рыцарскі гарадок» запрашаў маладых людзей на турніры, каб паказаць свой спрыт перад прывабнымі паненкамі.

Старт афіцыйным мерапрыемствам дало святочнае шэсце «Па родных вуліцах — з аркестрам!». Затым на стадыёне «Юнацтва» пачаўся ўрачысты канцэрт «Стоўбцы! Мы лёсам звязаны з табою!». Самы актыўны ўдзел у свяце прынялі і юныя грамадзяне горада. У прыватнасці, выхаванцы Стаўбцоўскай дзіцячай школы мастацтваў выступілі з канцэртнай праграмай «Табе, любімы горад, сёння мы пяём!» у парку «Дружба народаў» і на танцпляцоўцы «Вербачка». Тэатралізаванае прадстаўленне «У гасцях у казкі» паказалі навучэнцы Дзераўнянскай дзіцячай школы мастацтваў. Удзельнікі свята дружна падпявалі зоркам беларускай эстрады: Ірыне Дарафеевай, Вользе Плотнікавай, Сяргею Любавіну, танцавалі разам з шоу-балетам «Феерыя» і іншымі. Шмат моладзі сабрала маладзёжная група «Кавер-FM».

**Старт афіцыйным мерапрыемствам дало святочнае шэсце «Па родных вуліцах — з аркестрам!». Затым на стадыёне «Юнацтва» пачаўся ўрачысты канцэрт «Стоўбцы! Мы лёсам звязаны з табою!»**

На працягу дня ў парку і на стадыёне працавалі розныя атракцыёны, зона фудкорта, выстаўкі-кірмашы, прадаваліся салодкая вата і папкорн, марожанае ды іншыя ласункі, чаму асабліва радаваліся дзеці. Вечарам неба над горадам расквеціў феерверк. А затым пачалася маладзёжная дыскатэка з удзелам рэзідэнта радыёстанцыі «Пілот-FM» МС Улада Кабякова і DJ PS.

— Сапраўды, такога відовішчнага мерапрыемства мы ніколі не бачылі ў сваім жыцці. Добра адпачылі, павесяліліся ад душы. Мы рады, што жывём у Стоўбцах і ганарымся, што горад такі прыгожы, добраўпарадкаваны, камфортны для жыцця, быту, адпачынку, — падзяліліся ўражаннямі дзве сяброўкі Ірына і Крысціна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Васіля ЗЯНЬКО**

■ Форум

# НЕ ІСНУЕ ПЕРАШКОД ДЛЯ САПРАЎДНАГА СЯБРОЎСТВА

**Беларускія стравы па старадаўніх рэцэптах прапанавалі ўдзельнікам і гасцям традыцыйнай сустрэчы памежных абласцей Беларусі, Расіі, Украіны і міжнароднага маладзёжнага форуму «Дружба-2018» у Ветцы. Фестываль прайшоў пад дэвізам «Радзіма — у сэрцы маім».**




Сёлета арганізатарам стаў беларускі бок. Свята пачалося сумеснай літургіяй праваслаўных і малебнам каля помніка адселеным пасля чарнобыльскай катастрофы вёскам. Працягнулася — урачыстым шэсцем дэлегацый памежных рэгіёнаў. На цырымоніі адкрыцця **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** падкрэсліў, што развіццё міжрэгіянальных сувязяў грунтуецца як на эканамічным, так і на гуманітарным кірунках, а таксама на сяброўскіх адносінах паміж людзьмі:

— Традыцыі штогод збірацца напярэдадні Дня моладзі амаль 50 гадоў. З цягам часу і зменай геапалітычнай сітуацыі нефармальны маладзёжны фестываль набыў новы статус — дыпламатычны. У нас адны карані, агульныя духоўнасць і гісторыя. Мы разумеем, што наша сіла — у адзінстве. А разам мы абавязкова захаваем мір і эканамічную стабільнасць — для нашых дзяцей, унукаў і праўнукаў.

Партнёрства Бранскай і Гомельскай абласцей будзе развівацца ва ўсіх сферах, адзначыў **губернатар Бранскай вобласці Аляксандр БАГАМАЗ:**

— Летась тавараабарот паміж Бранскай вобласцю і Беларуссю вырас на чвэрць у параўнанні з 2016 годам. Пры гэтым 40 % прыпадае на Гомельскую вобласць. Ёсць і сумесныя прадпрыемствы, прадукцыя якіх становіцца ўсё больш папулярнай. Нашы дзелавыя адносіны такія ж моцныя, як і непарушнае славянскае сяброўства. Мы прыкладзём усе намаганні, каб далейшае партнёрства развівалася ва ўсіх кірунках на карысць нашых грамадзян.



Да ўдзельнікаў міжнароднага форуму звярнуўся і **першы сакратар Чарнігаўскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі Украіны Уладзімір ЛЕШЧАНКА.** Ён адзначыў, што сустрэча памежных рэгіёнаў — вельмі шчырае мерапрыемства, а ў гісторыі славянскіх народаў шмат агульных старонак.

Гасцей свята запрашалі на выстаўкі карцін і фатаграфій «Мая малая радзіма», экспазіцыю «Суквецце рамёстваў», літаратурную пляцоўку «Чытай, славянін!», выстаўкі «Лісты з фронту» і «Маршалы Перамогі»... На тэматычнай пляцоўцы «Назад у СССР» можна было ўбачыць фотазамалёўкі, плакаты савецкай эпохі, піянерскія гальштукі і камсамольскія значкі, прадметы інтэр'ера і атрыбуты быту савецкіх часоў. Паглядзець усе пляцоўкі, а таксама канцэрт, паказ дызайнерскіх калекцый, тэхнічную і дэкаратыўна-прыкладную творчасць навучэнцаў крыху перашкаджаў дождж. Тым не менш і яму ўсе, хто жыве ў палескім памежжы, радаваліся неверагодна. Бо не толькі паўднёвы ўсход Беларусі пацярпеў з-за адсутнасці вільгаці — Браншчына з Чарнігаўшчынаю таксама. Менавіта таму прыйшлі да высновы, што ён прынёс палёгку ўсім у той момант, калі славяне сабраліся разам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Запрашальнік

## «ДЗЕНЬ ВЫШЫВАНКІ»

**пройдзе 2 ліпеня ў Мінску на пляцоўцы каля Палаца спорту**

**Галоўным атрыбутам яго стануць элементы беларускага арнаменту на адзенні, паведамілі ў Цэнтральным камітэце БРСМ. І ўсе, хто мае такія, паўдзельнічаюць у флэшмобе «Усе ў вышыванках» і, пры жаданні, у сэлфі-фотаконкурсе.**

На пляцоўцы будуць працаваць фудкорт «Беларуская карчма», літаратурная гасцёўня «Смак роднай мовы», салон беларускага арнаменту «Родныя ўзоры», інтэрактыўныя экспазіцыі «Родны кут» і «Народныя гульні», дзіцячая пляцоўка. Рамеснікі запросяць на майстар-класы ў «Горад майстроў». Аграсядзібы з усёй краіны пазнаёмяць са сваімі прапановамі. Карыстальнікі Інстаграма змогуць пазмагацца за прызы ў інтэрнэт-квэсце «Мая Беларусь», а аматары жывых выступленняў — атрымаць асалоду ад музычна-танцавальных падарункаў удзельнікаў творчай эстафеты «Беларусь — крыніца натхнення». Модніцам і эстэтам напэўна спадабаецца дэфіле мадэляў «Вянок прыгажосці». І вядома, ніхто не ўтрымаецца ад танцаў пад палымяныя рытмы фолк-дыскатэкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**